# 1917
# 1941

## У АГНІ РЭВАЛЮЦЫЙ І ВОЙНАЎ

### За ўладу Саветаў

1917 год. Мазыр жыў напружаным трывожным жыццём прыфрантавога горада, вайна патрабавала ўсё новых ахвяр, падаў узровень жыцця насельніцтва, але ніхто не здагадваўся, якія небывалыя выпрабаванні, якія вялікія гістарычныя падзеі неўзабаве напаткаюць народ.

Праз некалькі дзён пасля таго, як у Петраградзе перамагла Лютаўская рэвалюцыя, мазыране даведаліся аб стварэнні Часовага ўрада. У горадзе і яго ваколіцах адбываліся сходы і мітынгі, удзельнікі якіх адзінадушна віталі перамогу над царызмам.

Прыкметную ролю ў лютаўскіх падзеях на Мазыршчыне адыгралі матросы Прыпяцкага атрада суднаў, якія базіраваліся ў Мазыры. Гэты атрад у першую сусветную вайну ўваходзіў у склад Заходняга фронту.

Пра падзеі тых дзён расказвае актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага руху на Мазыршчыне У. І. Мазуркевіч. «Пасля таго, як 28 лютага 1917 г. быў распаўсюджаны маніфест імператара Мікалая II аб адрачэнні ад трона і стала вядома, што ўлада перайшла ў рукі Часовага ўрада, у Мазыры быў праведзены агульнагарадскі мітынг. Вялікі двор мужчынскай гімназіі ўяўляў незвычайнае відовішча. Адзін за адным выступалі прамоўцы з палымянымі прамовамі. Гаварылі пра тое, што ўжо трэці год ідзе вайна за інтарэсы капіталістаў, з кожным днём усё больш ахвяр. Канец вайны можа прыблізіць толькі народ, калі ён завершыць рэвалюцыю і возьме ўладу ў свае рукі... Усюды палымнелі лозунгі «Далоў царскі ўрад!», «Далоў вайну!», «Няхай жыве дэмакратычная рэспубліка!»...»

Хутка былі прагнаны са сваіх пасад чыноўнікі старога рэжыму. Замест губернатараў, павятовых начальнікаў прызначаліся прадстаўнікі Часовага ўрада — губернскія і павятовыя камісары. Новая ўлада ахвотна падтрымлівала стварэнне камітэтаў, камісій і іншых арганізацый, якія супрацоўнічалі з ёй. Мэта іх была — накіраваць жыццё правінцыі ў рэчышча «парадку і цішыні», забяспечыць непадзельную ўладу Часовага ўрада і працяг вайны.

Мазырскім павятовым камісарам быў прызначаны памешчык А. А. Булгак-Флёраў, што выклікала незадаволенасць насельніцтва. Камісар вымушаны быў адмовіцца ад пасады. У інфармацыйным лісце губернскага аддзела па справах мясцовага самакіравання гаварылася, што памешчык пакінуў сваю пасаду «без асаблівага націску»... Па прадстаўленні губернскага камісара мазырскім павятовым камісарам быў зацверджаны таварыш пракурора Мінскай акругі П. М. Фалевіч, а Булгак-Флёраў узначаліў павятовую земскую ўправу.

Палітычнае жыццё ў Мазыры ажывілася. Розныя партыі спяшаліся стварыць у горадзе свае арганізацыі. Да



Дэлегаты 1-га акруговага з'езда Саветаў

ўлады імкнуліся бундаўцы, сацыялісты-рэвалюцыянеры (эсэры), прадстаўнікі Аб'яднанай яўрэйскай сацыялістычнай партыі, Польскі выбарны камітэт, Партыя народнай вольнасці... Пачала дзейнічаць арганізацыя РСДРП, большасць якой складалі меншавікі. Бальшавіцкая група не была нават створана. У красавіку 1917 г. арганізавалася аб'яднаная РСДРП — меншавікі і бальшавікі. З «аб'яднанкай» мелі сувязь і бундаўцы. Дзейнічала невялікая арганізацыя БСГ (Беларуская сацыялістычная грамада). Кожная арганізацыя карысталася падтрымкай розных груп насельніцтва па нацыянальных і класавых прыкметах.

У сакавіку адбыліся выбары ў мазырскія Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Большасць месцаў атрымалі эсэры, бундаўцы і меншавікі. Саветамі кіравалі эсэры Малыкін і Каменеў.

Сялянам цяжка было разабрацца ў складанай палітычнай сітуацыі ў павеце. Камісары Часовага ўрада, земствы, Савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў пераконвалі сялян цярпліва чакаць лепшай долі, вырашэння зямельнай рэформы праз Устаноўчы сход. Памешчыкі між тым заставаліся пры сваіх інтарэсах.

У красавіку Саветы аб'ядналіся. Большасць месцаў захапілі прадстаўнікі згодніцкіх партый, якія падтрымлівалі Часовы ўрад. Амаль увесь дакастрычніцкі перыяд Мазырскім Саветам

кіраваў Малыкін. Сярод членаў выканкама Савета, у які ўваходзілі Лакін, Корнеў, Злотнікаў, Гафштэйн, Гурэцкая, Ермакоў і Каменеў, бальшавікоў не было, хоць у горадзе працавала нямала актыўных членаў гэтай партыі. Адзін з іх — дваццацігадовы рабочы фабрыкі «Маланка» Ф. І. Віршыц. У сакавіку 1917 г. яго выбралі старшынёй фабзаўкама. Разам з Ліўшыцам ён быў членам Савета. Пад іх кіраўніцтвам рабочыя фабрык «Маланка», «Прыма» адразу пасля Лютаўскай рэвалюцыі абяззброілі канвой і гарадавых.

8 красавіка Мазырскі Савет рабочых дэпутатаў прыняў пастанову аб 8-гадзінным рабочым дні, якая насіла рэкамендацыйны характар: «На чаргу павінна быць пастаўлена правядзенне ў заканадаўчым парадку 8-гадзіннага рабочага дня ... без памяншэння заработнай платы». Адначасова Савет папярэджваў аб недапушчальнасці неарганізаваных выступленняў рабочых, заклікаў да пагаднення з прадпрымальнікамі.

11 мая 1917 г. у адным з першых нумароў газеты «Известия Мозырского Совета рабочих и солдатских депутатов» паведамлялася, што ўводзіцца 8-гадзінны рабочы дзень, пазаўрочныя работы дазваляюцца ў парадку выключэння за двайную плату, а напярэдадні святаў — 7-гадзінны рабочы дзень. Забаранялася жаночая і дзіцячая праца на прадпрыемствах са шкоднымі ўмовамі. Прадпрымальнікі ўспрынялі пераход да 8-гадзіннага рабочага дня без супраціўлення, таму што вялікі попыт і высокія цэны на тавары дазвалялі перакласці лішнія затраты на пакупніка...

У маі 1917 г. на фабрыцы «Маланка» была створана бальшавіцкая ячэйка. У яе ўваходзілі рабочыя Траццякоў, Ліўшыц, Віктар Чарнецкі, Лерман, Фрыдман, Кірпічнікаў і Віршыц. Старшынёй ячэйкі быў абраны Ліўшыц, сакратаром — Віршыц. Лёс многіх першых бальшавікоў склаўся трагічна. У барацьбе за ўладу Саветаў загінулі Траццякоў, Лерман, Фрыдман. У 1920 г. белапалякі павесілі Кірпічнікава.

У маі — чэрвені ў Мазыры прайшла забастоўка рабочых абутковых майстэрняў. У ходзе яе заработная плата была павышана ад 40 да 100 працэнтаў. Рабочыя актыўна падтрымлівалі забастоўку калектыву лесапільна-фанернага завода на ст. Пціч. У дапамогу забастоўшчыкам было сабрана 317 рублёў. На неспакойную станцыю прыбылі мазырскія рабочыя Малышкін і Петравец, якія рашуча падтрымлівалі рабочых завода. Забастоўка працягвалася 27 дзён і закончылася перамогай рабочых.

Вясной і ўлетку 1917 г. пад націскам рэвалюцыйнай барацьбы ў гарадах узмацніўся і сялянскі рух. Сяляне захоплівалі зямлю, маёмасць гаспадароў, высякалі казённы і памешчыцкі лес, праганялі з пасад чыноўнікаў Часовага ўрада. Батракі і малазямельныя сяляне падняліся супраць памешчыка Лянкевіча ў маёнтку Міхалкі. Уладальнік маёнтка Сідзельнікі Багдан Абуховіч, які меў 380 дзесяцін зямлі, тэлеграфаваў 26 чэрвеня міністру ўнутраных спраў, што Міхалкаўскі камітэт самавольна дзеліць зямлю. Барбароўскі памешчык Горват таксама прасіў абараніць яго ад самавольных дзеянняў сялян і мясцовых камітэтаў.

Сялянскія хваляванні пракаціліся па ўсім Мазырскім павеце. Першым арганізаваным мерапрыемствам стаў сялянскі з'езд, які адбыўся 29 красавіка. Пасля абмеркавання пытання аб зямлі з'езд запатрабаваў бясплатнай перадачы беззямельным сялянам усіх памешчыцкіх, царкоўных і іншых земляў. З такім жа патрабаваннем з'езд накіраваў дэлегатам на I Усерасійскі сялянскі з'езд старшыню Мазырскага павятовага зямельнага камітэта Ф. Цалко, які, аднак, не апраўдаў даверу сялян. З'езд прызнаў неабходным працяг вайны, адобрыў «заём свабоды», выказаў давер Часоваму ўраду.

Ліпеньскі расстрэл дэманстрацыі рабочых і салдат у Петраградзе выклікаў гнеўнае абурэнне мазыран. Была праведзена дэманстрацыя пратэсту, але

кіраўніцтва Мазырскага Савета ўпарта падтрымлівала дзеянні Часовага ўрада.

У жніўні мазырскія бальшавікі выйшлі з аб'яднанага камітэта, разарвалі адносіны з «абаронцамі» і стварылі самастойную арганізацыю. 23 жніўня Палескі камітэт РСДРП(б) накіраваў мазырскай арганізацыі бальшавікоў пісьмо, у якім ухваляў рашэнне «аддаліцца ад «абаронцаў», абяцаў усемагчымую падтрымку, дапамогу літаратурай, сувязь з ЦК партыі і прапанаваў прыняць удзел у канферэнцыі бальшавікоў Паўночна-Заходняга краю ў Мінску.

Палітыка Мазырскага Савета была непастаяннай і супярэчлівай. Савет узяў пад свой кантроль, абапіраючыся на рабочыя дружыны, станцыі Мазыр, Калінкавічы, прыстань на Прыпяці, пошту, тэлеграф. На мітынгах салдаты адмаўляліся ісці на Петраград, арыштоўвалі афіцэраў. І адначасова Мазырскі Савет, кіраўнікі прафсаюза актыўна выступалі ў падтрымку Часовага ўрада. 30 жніўня Савет заявіў, што гатовы прыкласці ўсе намаганні, каб абараніць адзіную, прызнаную ўсёй краінай вярхоўную ўладу — Часовы ўрад.

У сярэдзіне мая адбыўся 2-гі з'езд сялянскіх дэпутатаў, у чэрвені — 3-ці. Яму папярэднічалі бурныя падзеі. Савет паспрабаваў збавіцца ад бальшавіка, афіцэра 3-й арміі В. Азарава, які карыстаўся вялікім аўтарытэтам у горадзе і павеце. Камандуючаму Заходнім фронтам быў накіраваны зварот з просьбай адклікаць з Мазыра Азарава, які актыўна выступаў «з прапагандай бальшавізму ў прыфрантавой паласе, што дрэнна ўздзейнічае на сялян і салдат», і перадаць яго справу ў франтавую пракуратуру. У рабоце з'езда ўдзельнічала вялікая група салдат.

5 верасня адбыўся 4-ты з'езд сялянскіх дэпутатаў, на рашэнні якога рашучы ўплыў аказалі бальшавікі. З'езд запатрабаваў стварыць кіруючыя органы з прадстаўнікоў рабочых і сялян, перадаць сялянам зямлю памешчыкаў, адмяніць смяротную кару на фронце, аб'явіць раўнапраўе нацый, неадкладна падпісаць дэмакратычны мір.

Уплыў бальшавікоў усё больш адчуваўся ў горадзе. Пад іх націскам 4 верасня Савет абмеркаваў контррэвалюцыйнае выступленне Карнілава, запатрабаваў устанавіць рабочы кантроль над вытворчасцю і размеркаваннем, нацыяналізаваць банкі і буйныя прадпрыемствы, спыніць вайну, распачаць барацьбу з разрухай, увесці прагрэсіўны падатак.

5-ты з'езд сялянскіх дэпутатаў Мазырскага павета адбыўся 6—7 кастрычніка. У прэзідыум яго ўваходзіў член Мінскага камітэта РСДРП(б) і Мінскага Савета М. І. Крывашэін, якога выбралі ганаровым старшынёй з'езда. У прэзідыуме былі В. Азараў, сяляне Чубар, Місачэнка, Ветраў. З'езд выпрацаваў рашучую, непрымірымую рэзалюцыю, якая патрабавала абмежавання правоў памешчыкаў, капіталістаў і банкіраў, неадкладную перадачу зямлі сялянам, скліканне Устаноўчага сходу.

Бальшавіцкі характар рэзалюцыі з'езда адзначылі газеты «Свободный народ» і «Речь», якія сцвярджалі, што гэтая рэзалюцыя з'яўляецца «пагрозай анархіі». Павятовы камісар П. Фалевіч дакладваў галоўнаму ўпраўленню міліцыі, што ў павеце разрастаюцца беспарадкі, сяляне захопліваюць і дзеляць зямлю памешчыкаў. «Становішча з кожным днём становіцца горшым. Хутка яно стане пагражальным дзякуючы бальшавіцкай рэзалюцыі сялянскага з'езда».

У верасні — кастрычніку ў населеных пунктах павета адбылося звыш дваццаці сялянскіх хваляванняў. Батракі патрабавалі перадаць ім зямлю памешчыкаў, царкоўнікаў і кулакоў, ліквідаваць кабальную арэнду, палегчыць падатковы цяжар.

Маскоўская эсэраўская газета «Зямля і воля» паведамляла, што на аснове пастановы Мазырскага павятовага зямельнага камітэта сяляне захопліваюць яравыя палі і сеюць жыта. Газета «Речь» — цэнтральны орган партыі ка-

дэтаў — змясціла паведамленне, што з'езд сялян, які адбыўся ў Мазыры, прыняў шэраг рэзалюцый бальшавіцкага характару.

Увосень 1917 г. рэвалюцыйны рух узняўся на самую высокую ступень. Становішча ў Беларусі было неспакойным: дэманстрацыі, сялянскія выступленні, хваляванні салдат Заходняга фронту. 25 кастрычніка Часовы ўрад быў звергнуты. II Усерасійскі з'езд Саветаў у Петраградзе ўтварыў Савет народных камісараў на чале з У. І. Леніным. Улада ў Мінску і ў Мінскай губерні перайшла ў рукі Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта.

У Мазыры Савецкая ўлада ўстанаўлівалася з вялікімі цяжкасцямі. Уплыў аказвала тое, што ў Савеце рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў бальшавікі, як і раней, былі ў меншасці. Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў не падтрымаў кастрычніцкі пераварот. Старшыня Савета Малыкін заявіў: «Нашы таварышы-бальшавікі памыляюцца, беручы ўладу ў свае рукі. Гэта прывядзе да анархіі...»

Савет пачаў сабатаваць мерапрыемствы Савецкай улады. Рабочыя фабрык «Прыма», «Маланка» і іншых прадпрыемстваў, матросы Прыпяцкага атрада суднаў патрабавалі зняць стаўленікаў Часовага ўрада з іхніх пасад і стварыць ваенна-рэвалюцыйны камітэт. Так былі прагнаны павятовы камісар Фалевіч і яго намеснік Ліякумовіч, начальнік міліцыі Несцярэнка і іншыя. Быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт на чале з радавым 510-га Васільсурскага палка М. І. Паўлавым. У Савет увайшлі бальшавікі Барабанаў, Азараў, Ліўшыц, матрос Сядых, Лук'яновіч і Э. Гурэцкая (Бунд).

Вялікую дапамогу пры ўстанаўленні Савецкай улады ў Мазыры аказаў накіраваны з Мінска Ваенна-рэвалюцыйным камітэтам Заходняй вобласці і фронту 24-гадовы бальшавік С. В. Федаровіч. Нягледзячы на маладосць, ён не раз арыштоўваўся царскімі ўладамі за палітычную агітацыю. Быў

М. І. Паўлаў



упаўнаважаным Мінскага камітэта РСДРП(б) па ўстанаўленні Савецкай улады на Мазыршчыне.

Хутка была створана новая міліцыя, у складзе якой налічвалася 30 чалавек. Начальнікам быў прызначаны бальшавік А. М. Кухнавец, жыхар вёскі Барбароў. Трэба было паставіць рашучы заслон крадзяжу дзяржаўнай маёмасці, спекуляцыі, хуліганству, бандытызму. Міліцыі дапамагалі рабочыя-дружыннікі.

На вёсцы таксама было неспакойна. Пасля таго як прыйшлі весткі аб перавароце ў Петраградзе, сяляне вёскі Міхалкі П. С. Каленік, Н. С. Калеснік, Л. П. Краўчанка і іншыя, узброіўшыся хто чым мог, арыштавалі памешчыка Лянкевіча. Зямля і маёмасць былога гаспадара маёнтка перайшлі ў рукі валаснога рэвалюцыйнага камітэта. Так зрабілі сяляне амаль па ўсёй Мазыршчыне.

Стары гарадскі Савет у Мазыры так і не прыняў новай улады. 6-ты з'езд сялянскіх дэпутатаў 22 і 23 снежня, хоць і прызнаў ваенна-рэвалюцыйны камітэт адзінай уладай у павеце, запісаў у сваёй рэзалюцыі аб стварэнні сацыялістычнай улады з прадстаўнікоў некалькіх партый. Міліцыя напала на след падпольнай гарадской управы, спроба арганізаваць антысавецкую дэманстрацыю была спынена.

На выбарах ва Устаноўчы сход у лістападзе і снежні 1917 г. адзінаццаць партый і арганізацый прапаноўвалі сваіх кандыдатаў. Вялася настойлі-



Супрацоўнікі мазырскай міліцыі, узнагароджаныя імяннымі шаблямі. Стаяць (злева направа): К. І. Шыбут, Н. М. Гецька. Сядзяць (злева направа): С. Дземідзенка, К. П. Трапачка. 1923

вая агітацыя сярод насельніцтва, стваралiся кааліцыі. Бальшавікі не прынялі прапанову бундаўцаў аб вылучэнні адзіных кандыдатаў, але не паспелі паведаміць аб гэтым выбаршчыкам. Звесткі аб выніках галасавання былі пададзены са спазненнем. У Мазырскім павеце і гарнізоне поўную перамогу атрымалі бальшавікі, у Мазыры большасць галасоў атрымалі чатыры яўрэйскія арганізацыі.

Многа галасоў атрымана было і польскім нацыянальным спісам. Буржуазныя партыі (кадэты, рускі дэмакратычны спіс) падтрымала невялікая колькасць выбаршчыкаў. Каля трох тысяч галасоў атрымала БСГ. На поўную перамогу разлічвалі эсэры, але пад уплывам салдат-франтавікоў і матросаў Балтыйскага флоту, якія вярнуліся ў вёскі, сяляне аддавалі свае галасы бальшавікам.

Нестабільным заставалася становішча ў Мазыры на пачатку 1918 г. 5 студзеня на пасяджэнні Мазырскага Савета распрацоўваўся наказ дэлегату III Усерасійскага з'езда Саветаў матросу Выбарных: Устаноўчы сход павінен складацца з прадстаўнікоў рабочых і сялян, у ім павінны мець сваіх прадстаўнікоў сацыялістычныя партыі. Уся ўлада на месцах — Саветам. Эсэр Марціновіч, бундаўка Гурэцкая і іншыя выступілі супраць і прапанавалі выбраць іншага дэлегата. Патрабаванне было адхілена, але ў наказ увайшла прапанова аб устанаўленні Савецкай улады («сацыялістычнай улады») з прадстаўнікоў усіх небуржуазных партый.

На працягу студзеня 1918 г. Савецкая ўлада мірным шляхам усталявалася па ўсёй тэрыторыі Мазырскага павета. Сярод змагароў за новую ўладу былі розныя людзі. Адны з іх прысвяцілі рэвалюцыйнай барацьбе ўсё сваё жыццё, другія былі далучаны да актыўнай палітычнай дзейнасці апошнімі бурнымі падзеямі. Энергічным, валявым чалавекам і камандзірам быў В. І. Азараў, які знаходзіўся ў гушчы падзей амаль увесь 1917 год. Дзякуючы свайму службоваму становішчу (служба тылу 3-й арміі) ён мог без перашкод ездзіць па павеце, ажыццяўляць сваю работу. У пачатку 1917 г. ён быў выбраны ў склад Мазырскага Савета сялянскіх дэпутатаў. У чэрвені, на 3-м з'ездзе сялян, нягледзячы на засілле эсэраў, В. Азараў быў выбраны намеснікам старшыні павятовага Савета сялянскіх дэпутатаў. Мясцовыя ўлады варожа адносіліся да работы Азарава, спрабавалі арыштаваць і перадаць яго ваеннаму суду, і ён вы-

мушаны быў часова пакінуць горад. Але пасля вярнуўся і прымаў актыўны ўдзел у рабоце 4-га і 5-га з'ездаў, якія прынялі бальшавіцкія рэзалюцыі. Разам з С. В. Федаровічам В. І. Азараў прыехаў у Мазыр у лістападзе 1917 г. і прымаў актыўны ўдзел ва ўстанаўленні тут Савецкай улады.

*Я. Фарбераў*

С. В. Федаровіч



**Федаровіч Сямён Васілевіч** нарадзіўся 20.8.1893 г. у в. Грычынавічы Мазырскага павета, актыўны ўдзельнік барацьбы за ўладу Саветаў. За палітычную агітацыю сярод сялян арыштоўваўся царскімі ўладамі ў 1910, 1913 і 1916 гг. У чэрвені 1917 г. выбраны старшынёй салдацкага камітэта роты, удзельнік кастрычніцкіх падзей у Мінску. Упаўнаважаны Мінскага камітэта РСДРП(б) па ўстанаўленні ўлады Саветаў у Мазырскім павеце. У перыяд нямецкай акупацыі ўдзельнік камуністычнага падполля на Мазыршчыне, у савецка-польскую вайну камісар дывізіі на Заходнім фронце.

Пасля грамадзянскай вайны на партыйнай і савецкай рабоце ў Сібіры, на Паўночным Каўказе. З 1939 г.— старшыня планавай камісіі Ленінскага райвыканкама Пінскай вобласці. Удзельнік камуністычнага падполля і партызанскага руху на Піншчыне ў Айчынную вайну. З 1944 г.— дырэктар Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Памёр 10.3.1968 г.

**Родам з Лубні**

К. П. Марціновіч нарадзіўся ў 1894 г. у мнагадзетнай сялянскай сям'і, у якой было пяцёра сыноў і дзве дачкі. Вучыліся дзеці ў наёмных настаўнікаў толькі ў зімовы час. Ксенафонт быў здольным вучнем, бацька імкнуўся даць яму магчымасць вучыцца далей. Да пачатку першай сусветнай вайны Марціновіч працаваў вясковым настаўнікам у Магілёўскай губерні. У 1914 г. паступіў у Віленскі настаўніцкі інстытут.

Рэвалюцыйныя падзеі на Беларусі захапілі маладога настаўніка. З мая 1917-га і да пачатку нямецкай акупацыі Палесся вясной 1918 г. Ксенафонт Піліпавіч Марціновіч — член выканкама Мазырскага павятовага Савета і намеснік старшыні Мазырскага рэвалюцыйнага камітэта. Калі горад захапіў вораг, перайшоў на падпольную работу. Пагражаў арышт, таму ён перайшоў лінію фронту і ўступіў у Чырвоную Армію.

У грозным 1919 г. Марціновіч на Паўднёвым фронце, галоўны палявы кантралёр.



К. П. Марціновіч (сядзіць, першы справа)

Пасля грамадзянскай вайны Ксенафонт Марціновіч назначаецца начальнікам ваенна-марской інспекцыі Наркамата рабоча-сялянскай інспекцыі краіны. З 1937 г. ён начальнік Першага галоўнага ўпраўлення Наркамата абароннай прамысловасці СССР.

Працуючы ў Маскве на адказнай дзяржаўнай пасадзе, К. П. Марціновіч меў шырокія сувязі з культурным, у тым ліку пісьменніцкім асяроддзем краіны. Асабліва дарагімі і незабыўнымі былі для яго сустрэчы з А. М. Горкім.

Высокі быў яго аўтарытэт у армейскіх колах і ва ўрадзе. У 1930 г. быў зацверджаны статут новага баявога ордэна Чырвонай Зоркі. Пастановай Прэзідыума УЦВК СССР 23 мая 1930 г. К. П. Марціновіч быў узнагароджаны ордэнам пад № 2.

А праз некаторы час у Чырвонай Арміі раскруцілася страшэннае кола палітычных рэпрэсій, якое захапіла і загубіла разам з тысячамі вядомых военачальнікаў і К. П. Марціновіча...

*М. Капач*

### АД МАЗЫРСКАГА САВЕТА СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ

Браты-сяляне! Уступаючы ў 1918 год, Мазырскі павятовы Савет сялянскіх дэпутатаў звяртаецца да вас з брацкім заклікам згуртавацца ў адну агульную дружную і стойкую арганізаваную сілу для прывядзення ў парадак разбуранага гаспадарчага апарата і адміністрацыйна-судовага ўпраўлення.

Новая земская ўправа ўжо адкрыла сваю дзейнасць. Цяжка ёй будзе справіцца і наладзіць разбураны фінансавы механізм. Але, мяркуючы па яднанню на сялянскім з'ездзе, мы разлічваем на шырокую і дружную падтрымку ўсіх сялян.

Мы верым у сілу рускага чалавека, у яго творчы розум і таму галосна скажам: мы перажылі стагоддзі прыгнёту царызму, перажывем і гэты час, канчаткова замацаваўшы за сабою волю, зямлю і брацтва народаў.

*Азараў*
Старшыня Савета, член Усерасійскага выканаўчага камітэта Саветаў

*«Известия Мозырского Совета рабочих и солдатских депутатов», 5 лютага 1918 г.*

## Адпор інтэрвентам

Пасля свайго першага ўсталявання Савецкая ўлада трымалася ў Мазыры нядоўга. 8 лютага 1918 г., парушыўшы пагадненне аб перамір'і, Германія накіравала свае войскі на ўсход. Нягледзячы на гераічнае супраціўленне толькі што створанай Чырвонай Арміі, немцы захапілі Мінск, Гомель, акупіравалі большую частку Беларусі. У пачатку сакавіка варожыя войскі ўзялі пад кантроль Мазыр і Мазырскі павет. Гэтая тэрыторыя ўвайшла ў склад «Палескай губерні», якая падпарадкоўвалася гетману Украіны Скарападскаму. За нямецкімі войскамі ў Мазыр прыйшло падраздзяленне гайдамакаў, пачала дзейнічаць іхняя «варта». Скарападскага хутка знялі з пасады, і гэтыя сілы сталі падпарадкоўвацца «галоўнаму атаману» Пятлюру.

На тэрыторыі, акупіраванай немцамі, было ўведзена ваеннае становішча. Жыхарам пасля 20 гадзін забаранялася выходзіць з дому, вокны яны павінны былі завешваць або закрываць аканіцамі. Усе газеты канфіскоўваліся, за выдачу палітычных агітатараў абяцалася ўзнагарода — 200 рублёў.

У свае маёнткі вярнуліся многія памешчыкі. Мясцовая ўлада ўвяла ўсемагчымыя грашовыя і натуральныя падаткі, у тым ліку пастаўкі буйной рагатай жывёлы, коней, авечак, свіней, курэй, збожжа. Усё вывозілася ў Герма-